**Н. А. КЕНДЫШ,**
намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце гімназіі № 22 г. Мінска

# «ПА ДАРОЗЕ ДА КОЛАСАВАЙ ЗЯМЛІ...»

## Праект для вучняў IX класа

**Для кожнага з нас дарагое імя Якуба Коласа, гэта знакавая асоба ў гісторыі Беларусі. Кожны навучальны год знаходжу нагоду і час, каб яшчэ раз успомніць, перачытаць і наноў адкрыць і для сябе, і для вучняў неабсяжны духоўны свет яго творчасці. Менавіта таму наладжваю з вучнямі праектную працу, прычым распачынаю яе ў IX класе. Менавіта гімназісты-дзевяцікласнікі пачынаюць падрабязна, грунтоўна вывучаць творчы шлях Якуба Коласа.**

**Як можна не любіць Коласа, нашага вялікага нацыянальнага паэта, не паважаць яго, не ведаць яго біяграфію? Таму для мяне было важна, каб адкрытае, знойдзенае, знятае, сфатаграфаванае, пачутае вучнямі пра самога Коласа, пра мясціны, якія вядуць да яго радзімы, пра яго радзіму запомнілася ім на доўгае жыццё. Хацелася, каб усё гэта засталося для выхаванцаў, іх будучыні як спадчына, незабыўныя старонкі памяці.**

Мэта: пашырыць веды гімназістаў пра біяграфію і творчую спадчыну Якуба Коласа; заахвочваць да самастойнага пошуку інфармацыі, навучаць працы з энцыклапедычнымі даведнікамі і іншымі крыніцамі, практычна прымяняць атрыманыя веды, умець творча выкарыстоўваць іх ва ўласнай дзейнасці; развіваць камунікатыўную культуру і ўменні вучняў працаваць у групе, праводзіць даследчую працу (вывучэнне літаратуры, збор матэрыялу, назіранне, абагульненне); выхоўваць павагу да асобы і спадчыны Якуба Коласа, мовы беларускага народа.

Час выканання праекта: 3 месяцы.

Удзельнікі праекта: вучні IX класа.

### Этапы падрыхтоўкі і абароны праекта

**I. Праектная ініцыятыва.**

Выбар, фармуляванне і абмеркаванне тэмы праекта «Па дарозе да Коласавай зямлі...», вызначэнне асноўных кірункаў даследчай працы.

**II. Вызначэнне канчатковага выніку праекта.**

Знаёмства завочна і ўвачавідкі з радзімай Якуба Коласа, усведамленне месца творцы і яго творчасці ў жыцці і літаратуры, іх ролі ў развіцці асобы і грамадства.

**III. Стварэнне груп і размеркаванне абавязкаў.**

Кіраўнік праекта (настаўнік), кансультанты (спецыялісты: бібліятэкары, музейныя работнікі і інш., бацькі навучэнцаў), удзельнікі праекта (сацыёлагі, літаратары-аналітыкі, турысты-экскурсаводы па чыгунцы, турысты-экскурсаводы аўтобуснай паездкі, чытальнікі, бібліёграфы).

**IV. Распрацоўка групавога навучальнага маршруту.**

*Навошта?* — паглыбіць свае веды, усвядоміць важнасць тэмы даследавання, прыцягнуць увагу найбольшай колькасці людзей.

*Каму раскажам?* — усім, каму зможам.

**V. Правядзенне мазгавога штурму. Стварэнне банка ідэй.**

- Пазнаёміцца з жыццём і дзейнасцю Якуба Коласа, звязанай непасрэдна з месцамі дзяцінства песняра.
- Правесці апытанне сярод гімназістаў па пытаннях:

1. Назавіце мясціны, звязаныя з дзіцячымі і юнацкімі гадамі Якуба Коласа.

2. Увіце, што да вас прыехалі замежныя госці. Якім шляхам вы прапануеце ім паехаць на радзіму Якуба Коласа?

3. Ці былі вы там самі з сям'ёй альбо з экскурсійнай групай?

• Пазнаёміцца з населенымі пунктамі пры чыгунцы па дарозе на радзіму Якуба Коласа.

• Наладзіць экскурсійную паездку на радзіму Якуба Коласа.

• Сабраць скарбонку паэтычных твораў, прысвечаных родным мясцінам паэта.

• Скласці спіс літаратуры, які дапаможа знайсці падрабязную інфармацыю па тэме праекта.

• Наладзіць выставу кніг.

**VI. Збор матэрыялу і публікацый пра жыццё і творчасць Якуба Коласа. Кансультаванне (настаўнікамі, спецыялістамі, бацькамі).**

**VII. Калектыўнае абмеркаванне выкананай працы.**

Выбар формы абароны праекта (творчая справаздача з выкарыстаннем відэафільма і мультымедыйнай прэзентацыі).

**VIII. Абарона праекта.**

| Удзельнікі | Абавязкі (задачы) |
|---|---|
| Кіраўнік, памочнікі кіраўніка (вядучыя) | Абгрунтаваць прычыны выбару тэмы, скласці сцэнарый да прэзентацыі праекта. |
| Сацыёлагі | Прадставіць вынікі атрыманай інфармацыі пры апытанні гімназістаў, прааналізаваць ступень актуальнасці тэмы праекта. |
| Літаратары-аналітыкі | Ахарактарызаваць асобу Якуба Коласа як пісьменніка, пачынальніка і класіка нацыянальнай літаратуры, беларускага адраджэнца і асветніка, патрыёта Беларусі, яе песняра. |
| Турысты-экскурсаводы па чыгунцы | Прадэманстраваць відэафільм, зняты самімі вучнямі, у час вандроўкі па дарозе на электрычцы ад Мінска да Стоўбцаў. |
| Турысты-экскурсаводы ў аўтобуснай паездцы | Прэзентаваць матэрыял для экскурсійнай паездкі на радзіму Якуба Коласа. |
| Чытальнікі | Прадставіць скарбонку сабраных твораў, прысвечаных беларускаму песняру. Пачытаць выбранае ў суправаджэнні мультымедыйных прэзентацый. |
| Бібліёграфы | Падрыхтаваць выставу да абароны праекта кніг пра Якуба Коласа, яго жыццё і творчасць. |

**IX. Рэфлексія.**

1. Што вы адчувалі ў час працы над праектам?

2. Што вы адчуваеце цяпер?

Рэкламны блок да прэзентацыі:

• У вас будзе магчымасць стаць удзельнікам віртуальнай экскурсіі па месцах дзяцінства і юнацтва Якуба Коласа...

• Кожны з вас зможа паехаць на электрычцы ад Мінска да Стоўбцаў, да Коласавай зямлі. А таксама можна выправіцца ў завочнае падарожжа...

• Вы дакранецеся да багатай Коласавай творчай спадчыны, пачуеце вершы беларускіх паэтаў, што прысвечаны песняру...

## Абарона праекта

*Праект адкрываецца чытаннем урыўка з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» «Мой родны кут...».*

Першы вядучы. Сёння мы запрашаем вас у падарожжа на радзіму Якуба Коласа. Звычайна перад ад'ездам мы складаем спіс усіх рэчаў, якія могуць нам спатрэбіцца, збіраем чамаданы. Але, на мой погляд, галоўным таксама з'яўляецца і тое, што мы павінны вырашыць для сябе: з якой мэтай едзем у тую ці іншую краіну, дзеля чаго? І спадзяюся, што пасля праекта кожны прысутны зможа адказаць на пытанне «Які шлях да Коласа мы выбіраем?».



**Першы літаратар-аналітык.** «Ад роднае зямлі, ад гоману бароў...» Памятаеце гэтыя радкі з уступу да «Сымона-музыкі»? Менавіта роднай зямлі, барам, казкам ды песням удзячны Пясняр за той цудоўны скарб, што выспеў у ягонай душы і які сам ён аддае людзям «як доўг, як дар». Пясняр — своеасаблівы сувязны паміж прыродай і народам, паміж мінуўшчынай і будучыняй. Ён — павадыр, які бачыць шлях да лепшай долі, да «новае зямлі» і спрабуе вывесці ў гэты новы, радасны свет сваіх суайчыннікаў.

Такі Якуб Колас. Сыноўняй удзячнасцю роднаму краю — проста за яго прыгажосць, проста за тое, што ён РОДНЫ — прасякнута ўся творчасць Песняра. Спасцігаючы навакольны свет, беларускую прыроду, Колас спазнаваў адначасова і таямніцы ўласнай душы, наладжваў тонкую сувязь з Сусветам. Можа, у гэтым парадоксе — чым бліжэй прытуляешся да Зямлі, тым хутчэй дасягаеш Неба (спазнаеш Ісціну) — і варта шукаць сёння нам шлях у будучыню? Таму следам за Коласам...

**Другі літаратар-аналітык.** Паглядзіце, як паварочвае нас жыццё да зямлі. Сабраў горад людзей — ды не сагрэў духоўна. Каля гарадоў, як далі волю гараджанам, пабудавана мноства лецішчаў... Цягне, вабіць да сябе зямля, прыроднае ўлонне. Колас і на сваёй гарадской сядзібе (у двары сучаснай Акадэміі навук) сеяў жыта, меў там жа і пуньку з сенам, дзе ў цёплую пару любіў заначаваць...

Нехта скажа: дзівакаваў пад старасць дзядзька Якуб... Але ж за гэтым — цэлая коласаўская філасофія, якая мае глыбокія карані ў роднай зямельцы. Колас гэтак, як і нашы продкі, «вычытваў» у адкрытай кнізе прыроды (а прамаўлялі яму таемнае рака, лес, луг, поле, каласы, дрэвы...) глыбокую мудрасць. Праз асэнсаванне законаў прыроды ён спасцігаў таямніцы быцця, і гэта знайшло адлюстраванне ў яго паэмах «Новая зямля» і «Сымон-музыка», філасофскіх «Казках жыцця». Што ж да начавання ў сене, то сам Хрыстос нарадзіўся ў яслях (а не ў палацы), у простай сям'і — і колькі святла прынёс у гэты свет!

**Настаўнік** *(кіраўнік праекта)*. Мы запрашаем нашых слухачоў туды, «дзе льецца Нёман срэбраводны», не толькі дзеля таго, каб глыбей зразумець творчасць Якуба Коласа. Мы клічам вас на Стаўбцоўшчыну, у цудоўны куток Беларусі, каб з дапамогаю Коласа, поруч з ягоным талентам навучыцца самім адчуваць прыгажосць і гармонію ў краявідах, у прадметах побыту вяскоўцаў, іх звычаях, адзенні, песнях...

**Другі вядучы.** Коласавы творы, іх танальнасць — нібы чароўны ключ, якім кожны можа адамкнуць для сябе скарбніцу: душу роднай зямлі, роднага народа.

Паглядзіце на родны кут Коласавымі вачыма, звярніцеся да яго Коласавым словам, прыслухайцеся да яго Коласавым вухам, адчуйце яго Коласавым сэрцам — і адбудзецца цуд!

**Першы вядучы.** Вы зможаце пачуць галасы птушак, пабачыць срэбраводны Нёман і задумлівыя старыя дубы... Вы адчуеце харaство і непаўторнасць гэтай зямлі, каб потым ужо ніколі, ні пры якой нагодзе не парываць з ёю духоўную повязь.

Сапраўдны талент прыходзіць у свет не сабою здзівіць — светам здзівіцца, дапамагчы іншым адчуць духоўнае адзінства з людзьмі, што побач, з краем родным, з травінкаю кожнаю, з зоркаю, што ў небе. Паэты і мастакі дапамагаюць паяднацца ўсім духоўна — паяднацца, каб атрымаць моцы для далейшага самавыяўлення.

Прытулімся да Зямлі, каб прыўзняцца да Неба!

**Другі вядучы.** Сёння мы з вамі не толькі вандроўнікі, але і даследчыкі. І самыя першыя крокі ў падрыхтоўцы гэтага праекта зрабіла група сацыёлагаў, якая раскажа нам пра вынікі праведзенага апытання.

*Выступленне сацыёлагаў.*




**Першы вучань.** Нашым рэспандэнтам мы прапанавалі адказаць на наступныя пытанні:

1. Назавіце мясціны, звязаныя з дзіцячымі і юнацкімі гадамі Якуба Коласа.

2. Уявіце, што да вас прыехалі замежныя госці. Якім шляхам вы прапануеце ім паехаць на радзіму Якуба Коласа?

3. Ці былі вы там самі з сям'ёй альбо з экскурсійнай групай?

Другі вучань. Прадстаўленыя на слайдах вынікі апытання пераконваюць, што мы правільна выбралі тэму для даследавання. На вялікі жаль, на пачатку працы ў гэтым праекце асобныя ўдзельнікі не ведалі нават канкрэтнае месца нараджэння пісьменніка Якуба Коласа, не кажучы пра іншыя вельмі важныя факты біяграфіі славутага песняра. Зразумела, што на пытанне, які шлях маглі б прапанаваць замежным гасцям, навучэнцы гімназіі выказалі жаданне далучыцца да арганізаванай экскурсійнай паездкі, прытым менш за палову тых, хто адказаў на нашы пытанні, ужо пабывалі ў мясцінах, дзе прайшлі гады жыцця Якуба Коласа.

Першы вядучы. А цяпер — пра сапраўднае турыстычнае падарожжа, зробленае на радзіму Якуба Коласа па чыгунцы. У час экскурсіі быў зняты відэафільм, зроблена нямала фотаздымкаў, якія падрыхтаваны для прэзентацыі праекта. *(Дэманстрацыя слайдаў і відэафільма.)*

***Выступленне першай групы турыстаў-экскурсаводаў.***

Першы вучань. На зямлі ёсць мясціны, якія абавязкова, хоць аднойчы ў жыцці, мусіць наведаць ці не кожны беларус. Сярод іх і Стаўбцоўшчына, што нарадзіла, узгадавала і вывела ў вялікі свет слыннага Якуба Коласа. Прага больш блізкага знаёмства з Коласавай музай і прыцягвае прыхільнікаў таленту Песняра ў гэты цудоўны куток верхняга Панямоння.

У любой вандроўцы дарэчы будзе геаграфічная карта ці хоць атлас аўтамабільных дарог і чыгуначных шляхоў. На паўднёвым захадзе Мінскай вобласці лёгка адшукаць Стоўбцы. Вось і выбірайце, якімі шляхамі сюды дабрацца. Мы раім пры гэтым засяродзіць увагу на Мінску альбо Баранавічах. Бо менавіта з гэтых гарадоў у Стоўбцы можна даехаць электрычкай — надзейным і па сённяшнім часе адносна танным транспартам. Калі ж чыгунка вас не задавальняе, то замаўляйце з бацькамі аўтобусны тур — тады паедзеце па шашы, што стужкай уецца з гэтых жа гарадоў. Словам, у добры шлях!

Сёння мы яшчэ раз здзейснім падарожжа ў Коласаў край з Мінска, на гэты раз завочнае.

Мы асабліва не раздумвалі, на чым дабірацца ў Стоўбцы, — аддалі перавагу чыгунцы. Падарожжа на электрычцы займае ўсяго паўтары гадзіны. Менавіта столькі ж часу ў нас было на знаёмства з, так бы мовіць, калячыгуначнымі адметнасцямі, найперш літаратурнымі. Праўда, падрабязна распавесці пра іх за непрацяглы час проста немагчыма. Засяродзім увагу толькі на тым значным і адметным, што сустрэлася.

Другі вучань. За акном вагона мільгаюць абрысы беларускай сталіцы, застаюцца чыгуначныя прыпынкі Курасоўшчына і Гай... Сузіраючы хараство мясцовых краявідаў, мы неўпрыкмет мінаем і станцыю Памыслішча, і схаваныя ў зяляніне прычыгуначнай ахоўнай паласы прыпынкі Пціч ды Воўчкавічы. І вось, нарэшце, Фаніпаль.

Гэтае пасяленне вядома з даўніх часоў. У архіўных дакументах захавалася і другая назва — Чэчын, фальварак, уладанне Багдашэўскіх.

Праз пяць хвілін ходу электрычкі ад Станькава — Дзяржынск, райцэнтр. Гэта адно са старажытных паселішчаў на тэрыторыі Беларусі (упершыню згадваецца ў летапісных крыніцах каля 1146 г.). За сваю гісторыю гэты горад меў тры назвы: *Крутагор'е — Койданава — Дзяржынск.* Пра кожнае з найменняў існуе свая легенда. Пра набыццё апошняй назвы, напрыклад, гавораць, быццам пасля смерці Ф. Дзяржынскага бальшавікі пастанавілі назваць імем «жалезнага Фелікса» найбліжэйшы ад яго радзімы буйны горад. А паколькі маёнтак Дзяржынава, дзе нарадзіўся вядомы дзеяч расійскага рэвалюцыйнага руху, знаходзіўся ў тыя часы на тэрыторыі Польшчы, а Койданава было паблізу дзяржаўнай мяжы, то ціхае мястэчка і атрымала «рэвалюцыйную» назву.

Трэці вучань. У нашым падарожжы найбольш, так бы мовіць, насычанай літаратурнымі падзеямі мясцінай з'яўляецца Негарэлае. Гістарычныя абставіны складваліся так, што ў 20—30-я гг. мінулага стагоддзя гэта паселішча, а найперш чыгуначная станцыя, дзе робіць прыпынак і наша электрычка, даволі часта апынался ў гушчыні важных па тым часе падзей. Негарэлае было прыгранічнай станцыяй Савецкага Саюза на заходнім напрамку, і ўсе знакамітыя людзі абавязкова тут запыняліся па дарозе ў краіну Саветаў.

Пра тое, што тут неаднойчы бываў Максім Горкі, можна прачытаць на мемарыяльнай дошцы, якая ўмацавана на будынку чыгуначнага вакзала. Яна сведчыць аб сустрэчах «вялікага пралетарскага пісьменніка

з працоўнымі станцыі Негарэлае» ў 1928, 1929, 1931 і 1932 гг. Увекавечыў гэтую назву ў сваім вершы «Яны і мы» Уладзімір Маякоўскі:

На горизонте — белое. Снега
и Негорелое.

Спыняліся ў Негарэлым і іншыя вядомыя людзі. Нагадаем толькі некаторых з іх: рускія пісьменнікі Аляксей Талстой, Аляксандр Фадзееў, Аляксандр Купрын, Агнія Барто; французскія: Рамэн Ралан, Анры Барбюс; аўстрыйскі пісьменнік Стэфан Цвэйг; чэшскі публіцыст Юліус Фучык і многія іншыя.

Чацвёрты вучань. Любуючыся бярозавымі краявідамі, мы неўпрыкмет уязджаем на станцыю Коласава. Яе назву некаторыя атаясамліваюць з імем Якуба Коласа (маўляў, назва ў яго гонар). На самай справе Коласава як паселішча згадваецца пад такой жа назвай значна раней, прынамсі ў час будаўніцтва тут чыгункі ў 70-х гг. XIX стагоддзя.

Па дарозе да Стоўбцаў — адразу за Кучкунамі, з левага боку па ходу нашай электрычкі — зацікаўлены чалавек разгледзіць мясціну (цяпер там дачны пасёлак), вядомую ў нашай літаратуры пад назвай Цёмныя Ляды. Яна звязана з жыццём Якуба Коласа. Колькі гадоў таму ў час традыцыйнага літаратурнага свята «Каласавіны» на радзіме Якуба Коласа, у Цёмных Лядах, быў урачыста адкрыты мемарыяльны знак (каля чыгункі справа, блізка да праведзенай цераз чыгунку лініі электраперадач).

...Ну вось і Стоўбцы, канцавы пункт нашага падарожжа. Аднак гэта не азначае, што мы ўсё пра ўсё даведаліся і пра ўсё расказалі. Пагартайце і самі краязнаўчую літаратуру, калі маеце мажлівасць — пахадзіце па ваколіцах чыгуначных станцый і прыпынкаў.

Першы вядучы. А цяпер паслухаем пра экскурсію на радзіму Якуба Коласа, у якую група нашых гімназістаў адправілася на аўтобусе. Што там пачулі і ўбачылі — пра гэта яны раскажуць самі.

*Выступленне другой групы турыстаў-экскурсаводаў. Дэманстрацыя падрыхтаванай мультымедыйнай прэзентацыі «І мы хадзілі па той зямлі».*

Першы вучань. Трэцяга лістапада 1882 года ў нябеснай высі загарэлася новая яркая зорка. І нягледзячы на восеньскую непагадзь, у адно імгненне стала светла, лёгка, утульна на зямлі. Нарадзіўся Паэт. Нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, больш вядомы нам пад імем Якуб Колас.

Стаўбцоўшчына. Прынёманскі край. Вёска Акінчыцы. Менавіта тут нарадзіўся Якуб Колас. Але сцены акінчыцкай хаты ўсяго некалькі месяцаў чулі голас немаўляці, таму што па абставінах службы бацька Міхал часта мяняў месца жыхарства.



*Да 100-гадовага юбілею паэта Акінчыцкая лясная камора аднoўлена згодна з архіўнымі дакументамі. Сярод хатніх рэчаў найбольшую ўвагу прыцягвае калыска, дзе малы Кастусь слухаў матчыны калыханкі.*

Тут Міцкевічы жылі да 1 красавіка 1883 года. Зразумела, што пісьменнік не мог памятаць месца сваіх народзін. Але, прыязджаючы на радзіму, з задавальненнем прыпыняўся ў Акінчыцах, узгадваў іх у сваіх вершах.

Да 100-гадовага юбілею паэта Акінчыцкая лясная камора аднoўлена згодна з архіўнымі дакументамі. Сярод хатніх рэчаў найбольшую ўвагу прыцягвае калыска, дзе малы Кастусь слухаў матчыны калыханкі.

Другі вучань. Першага красавіка 1885 г. Міхал Міцкевіч быў пераведзены ў Ласток, глухі лясны куток. Усё тут было адкрыццём для хлапчука: гукі лесу, галасы птушак, вясёлка ў небе. Праз гады паэт пранёс гэта ўзвышанае пачуццё захаплення хараством прыроды, што потым знайшло адбітак у паэмах «Новая зямля» і «Сымон-музыка».

У 1890 г. Міцкевічы ў чарговы раз змянілі месца жыхарства. Сям'я пражыла ў Альбуці дванаццаць гадоў. Тут Кастусь вучыўся ў «дарэктараў», потым — у Нікольскім народным вучылішчы. Менавіта ў гэтай вёсцы ён напісаў свае першыя вершы.

Трэці вучань. У 1910 г. Міцкевічы набылі сваю хату ў Смольні. У верасні 1911 г., пасля турэмнага зняволення, сюды ўпершыню прыехаў Якуб Колас. Бедная і запусцелая здалася паэту Смольня. Каб хоць крыху зрабіць яе ўтульнай, Якуб Колас пасадзіў на сядзібе ліпы. Менавіта пад імі сядзелі маладыя Якуб Колас і Янка Купала ў час першай сустрэчы летам 1912 года.

«Шлях Коласа» — адзіны ў Беларусі мастацка-мемарыяльны комплекс. Хочацца

верыць, што добры пачатак па ўшанаванні памяці вялікага песняра на Стаўбцоўшчыне знойдзе працяг і ў іншых мясцінах, звязаных з яго імем, злучыць іх у адзін вялікі шлях.

Д р у г і  в я д у ч ы. У кожнай галіне мастацтва ёсць свае геніі, свае зоркі. У выяўленчым такім быў Леанарда да Вінчы, у музыцы — Моцарт. А ў нашай нацыянальнай літаратуры геніяльным мастаком слова стаў Якуб Колас. Ён — духоўны настаўнік беларусаў, адданы сын роднай зямлі, народны пясняр. Таму імя Якуба Коласа самае дарагое і блізкае для людзей розных пакаленняў, для нас, сучаснікаў.

Якубу Коласу і коласаўскім мясцінам прысвечаны шматлікія вершы. Наша група літаратуразнаўцаў падабрала для чытальнікаў творы ў гонар народнага паэта.

*Выступленне чытальнікаў (суправаджаецца мультымедыйнай прэзентацыяй).*

П е р ш ы  ч ы т а л ь н і к *(выконвае верш Міколы Маляўкі «Музеі ў Альбуці»).*

Лістоў залатыя завеі
Вятры бальшакамі грабуць,
Адкрыла да свята музеі
Калыска паэта
Альбуць.
Не ўбачыце экскурсавода,
Не ўбачыце хаты, двара.
З пяшчотай
сама прырода
Расказвае пра песняра.
Пад лапаў маршчыністых схоў
Прысядзьце на мох рабы —
І чалавечаю мовай
Тут загавораць дубы:
— Збірай жалуды на насенне,
Малым не губляў кароў,
Бо ведаў ад нараджэння
Зялёную мову дуброў...
Пайдзіце з карзінаю рана
К гасцінным
грыбным верасам,
І ў лесе любая паляна
Што-небудзь успомніць вам:
Вышэй абшчаперыўшы елку,
Ён, мокры ўвесь ад расы,
Гадзінамі слухаў ад золку
Птушыныя галасы...
З дарогі вадою напоіць,
Пасадзіць ля Белай гары,
Нічога ад вас не ўтоіць
Расчулены Нёман стары:
Сляды яго стоптаных ботаў
Дагэтуль хаваюць гаі,
Дзе песні паэта без нотаў
Спяваюць даўно салаўі.
А выспее сонца на славу,
Праведайце пашы,
лугі,
Дзе верасень косіць атаву,
Дзе летам прапахлі стагі,
Здаецца,
падай толькі голас, —
Адказам карчы
затрашчаць
І выйдзе з алешніку Колас
Да хлопцаў спацелых на луг.
Тут восень
не вые ваўкамі —
Арэхі ссыпае з ляшчын,
Частуе баравікамі,
Сузор'ямі журавін.
Здалёку і зблізку,
людзі,
Да нас прыязджайце часцей —
Музеі паэта ў Альбуці
Чакаюць,
чакаюць гасцей.

Д р у г і  ч ы т а л ь н і к *(выконвае верш Міколы Хведаровіча «Каласоўшчына»).*

У Смольні — Коласа музей.
Сцяжынка вузкая вядзе
Туды, праз лес —
У Прынямонне,
Дзе сосны звонкія гамоняць
На мове Коласа штодня.
Стаіць на варце цішыня,
Калі мінеш парог зялёны,
І заблішчыць срабрысты Нёман
Люстраным, казачным святлом.
Вось там стаіць утульны дом,
Дзе шчасце стрэў сваё паэт,
Дзе ўпершыню чароўны свет
Заваражыў яго вячыста,
Дзе Нёман хваляю бруістай
Пяшчотна раніцай купаў
Ў настоі прынямонскіх траў
І калыхаў яго ў прыполе.
А легкакрылы ветрык поля
Даносіў песню жаўрука.
О, Нёман!
Слаўная рака,
На мове Коласа апеты.
Тут сустракаліся паэты
У гэтым казачным кутку, —
У Смольні, Альбуці, Ластку
Не раз зязюля кукавала,
Яна Купалу сустракала

На гэтай Коласа зямлі.
Часы ўжо тыя адышлі,
Але ж у сэрцы не пагаслі.
І жыць надзея засталася...
Між звонкіх соснаў і дубоў
Нямала спелых жалудоў
Ляжаць у сховах Прынямоння.
Надыдзе час,
І сярод нас
Дубровай шумнай загамоняць
У новы, светлы дзень яны, —
Купалы, Коласа сыны.

Трэці чытальнік *(выконвае верш Еўдакіі Лось «Баравінка»)*.

Тут Колас жыў... Хадзіў каля ялін,
Шуршаў кіёчкам па лісцвянай прэлі,
З усмешкай выслухоўваў свісты,
трэлі
Усіх спевакоў з пахіленых галін.
На шчыры верш не шкадаваў хвілін,
А ў вольны час, калі імхі ірдзелі,
На хвоях рагі смольныя гарэлі,
Ішоў збіраць баравікі адзін...

Цяпер тут шэрань пабяліла шаты,
Спавіў галіны шызы мох калматы,
І веснавы спявак салоўка знік.

З дубоў лісцё цяжкое ўсё зляцела,
Пад снег схаваў карэнне баравік,
Каб летам баравінка зарудзела.

Чацвёрты чытальнік *(выконвае верш Генадзя Кляўко «Якубу Коласу»)*.

Ён — гаспадар,
што ўстаў раней за сонца,
Каб зерня для сяўбы
нарыхтаваць.
Было нялёгка
вузкія загоны
Спустошанае нівы
засяваць.
Ён — гаспадар.
Ён добра ведаў сілу
Тых слоў,
Што сейбіт
кажа на раллі.
Сыпнуў ён зерне —
буйна ўскаласіла
Краса тых слоў
на ўсёй яго зямлі.
Красуе ніва,
буйна каласіцца,
Яе сцяжынкі
ў новы свет вядуць...
Прыйшоўшы
гэтай ніве пакланіцца,
Ў дарогу ўзяць зярнятаў
не забудзь!

Пяты чытальнік *(выконвае верш Алеся Ставера «Творы Коласа»)*.

На беларускай роднай мове
Чытаю з захапленнем іх.
Як многа сілы ў кожным слове!
Як многа дум і мар у іх!
Яны — зямлі вялікай голас.
Калі чытаю, —
хвіляй той, —
Здаецца мне,
нібы сам Колас,
Як бацька, гутарыць са мной.

Першы вядучы. Хутка бягуць гады... Але колькі б часу ні прайшло, заўсёды будзе жыць у памяці людзей Якуб Колас, без імя якога немагчыма ўявіць родную літаратуру і нашу Беларусь.

«Колас — гэта хлеб, гэта само жыццё». Якуб Колас прыйшоў да нас, каб сказаць: «Гэта мы — беларускі народ! Вось у чым наша веліч і несмяротнасць».

Другі вядучы. Якуб Колас — наш гонар і слава. Ён — нацыянальны геній, без якога мы і ўвесь вялікі свет былі б нашмат бяднейшыя. Ярка зззяе яго літаратурная зорка на нашай зямлі, пад гэтым вечным небам.

Настаўнік (кіраўнік праекта). Вось і падыходзіць да заканчэння наш праект, і таму мне хацелася б падвесці вынікі.

Нашы коласаўскія даследчыкі разгледзелі сёння два шляхі на радзіму паэта: па чыгунцы і на аўтобусе. А які шлях да Коласа выбіраеце вы? Ці дапамаглі мы вам абраць гэты шлях? *(Адказы-меркаванні прысутных.)*

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

Беларуская літаратура: поўны курс падрыхтоўкі да тэставання і экзамену / П. І. Лявонава [і інш.] ; пад рэд. П. І. Лявонавай. — Мінск : ТэтраСістэмс, 2007. — 575 с.

*Белы, С.* Міхалава дрэва : [да 120-годдзя Якуба Коласа] / С. Белы // Полымя. — 2002. — № 9/10. — С. 313—326.

*Буцько, А. В.* Завочнае падарожжа «Шляхам Якуба Коласа» / А. В. Буцько // Нар. асвета. — 2009. — № 12. — С. 42—44.

# ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА

*Дзям'янка, В.* «Сагрэты быў пяскамі Наднямоння» : Стоўбцы ў жыцці і творчасці Якуба Коласа : літ.-муз. кампазіцыя / В. Дзям'янка // Роднае слова. — 2002. — № 9. — С. 93—96.

*Жаўнерчык, А.* Шляхамі Якуба Коласа : літ.-муз. імпрэза / А. Жаўнерчык // Роднае слова. — 2006. — № 8. — С. 100—102.

*Лужанін, М.* Колас расказвае пра сябе : аповесць-эсэ / М. Лужанін. — Мінск : Маст. літ., 1997. — 462 с. — (Школьная б-ка).

*Ляшук, В. Я.* Вывучэнне творчасці Якуба Коласа ў школе : дапам. для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. — Мінск : Аверсэв, 2006. — 320 с.

*Мушынскі, М.* Якуб Колас: летапіс жыцця і творчасці / М. Мушынскі. — Мінск : Беларус. навука, 2012. — 1126 с.

*Навуменка, І.* Якуб Колас: духоўны воблік героя / І. Навуменка. — Мінск : Выд-ва БДУ, 1981. — 237 с.

Чалавек і грамадства : энцыкл. даведнік. — Мінск : БелЭн, 1998. — 287 с.

*Чэмер, М.* Былі мы ў Коласа ў гасцях... / М. Чэмер // Настаўн. газ. — 2007. — 5 мая.